Киричук Мария Александровна

***

Мне бабуля аднойчы сказала,
Што бацькі іх "пад Польшчай" жылі.
Я на гэта яе запытала:
- Як "пад Польшчай"? На нашай зямлі?

І пачула аповед пра тое,
Як, амаль сто гадочкаў назад,
Незайздроснай была наша доля:
Нам судзілася "трапіць у заклад".

Пасля войнаў разменнай манетай
Тэрыторыя наша была,
Польшча мроіла даўняю мэтай
І здзяйсніцца ёй дапамагла.

Яна верыла: будзе магчыма
Паспалітую Рэч аднавіць,
І пад прывадам гэтым злачынным
Землі нашы змагла раздзяліць.

Лёс зямлі беларускай у Рызе
Вырашалі чамусьці без нас:
Зараз гэта апісана ў кнізе,
А тады - галашэння быў час.

Колькі жыццяў, бы лісце без дрэваў,
Сувязь страцілі з роднай зямлёй,
Дзе гучалі матуліны спевы
На ўлюбленай мове сваёй.

Васямнаццаць гадоў панавалі
На заходняй зямлі чужакі,
Беларускую мову цкавалі,
Навязалі сваю - наўпакі.

Беларусь не скарылася ціха,
Свае землі вярнула назад.
У мінулым засталася ліха,
Іншы стаў тут парадак і лад.

Мне бабуля мая гаварыла,
Як бацькі іх "пад Польшчай" жылі...
Веру я: Беларусь - гэта сіла!
Людзі - соль беларускай зямлі!